# АБ АСНОЎНЫХ НАПРАМКАХ ДЗЕЙНАСЦІ ЦК КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ ПА ВЫКАНАННЮ РАШЭННЯЎ XXXI З'ЕЗДА КПБ

## *Даклад А. А. МАЛАФЕЕВА на аб'яднаным пленуме ЦК і КК КПБ*

Таварышы! Мэта гэтага пленума — абмеркаваць, як нам працаваць далей, вызначыць асноўныя напрамкі дзейнасці Кампартыі Беларусі. Іменна з гэтага пункту гледжання трэба ўзважыць і ацаніць, істотна ўзбагаціць наяўны ў вас на руках праект праграмы дзеянняў па выкананню рашэнняў XXXI з'езда КПБ, у распрацоўцы якога многія з вас удзельнічалі.

Маецца на ўвазе, што наш пленум павінен даць грунтоўны штуршок да якаснага нарошчвання намаганняў партыйных арганізацый па стабілізацыі абстаноўкі. Вы адчуваеце яе ў сваім штодзённым жыцці. Ацэнку ёй даў нядаўні Пленум ЦК КПСС. Тым не менш лічу неабходным вельмі коратка спыніцца на некаторых яе асаблівасцях.

Злосная атака на партыю Леніна, спекуляцыі вакол негатыўных старонак нашай гісторыі, цяжкасцей перабудовы — гэта толькі шырма для прыкрыцця галоўнага. Нагнятаючы жорсткае процiборства, уцягваючы ў яго ўсё новыя грамадска-палітычныя рухі, прэсу, выкарыстоўваючы зніжэнне жыццёвага ўзроўню людзей, нашы ідэйныя праціўнікі ставяць зусім пэўную мэту—замену грамадска-палітычнага і дзяржаўнага ладу.

Шкада, што аб гэтым гаворым са спазненнем. Каб гэта было раней, сітуацыя ў краіне магла б і не дасягнуць такой крытычнай напружанасці. Бягучы момант дазваляе зрабіць і такі вывад: для барацьбы з КПСС, супраць сацыялізму, за развал Саюза ССР сілы, што процістаяць нам, у спешным парадку аб'ядноўваюцца ў адзіны антысацыялістычны і антыкамуністычны блок.

Такім чынам, намеціўся яўны адыход ад першапачатковых задум перабудовы. Слова «сацыялізм», абнаўленне якога было аб'яўлена яе галоўнай мэтай, сёння ўжо знікае з дакументаў нават некаторых афіцыяльных органаў.

Прыкметныя змяненні ў расстаноўцы палітычных сіл і ў нашай рэспубліцы. Заявілі аб сабе новыя палітычныя партыі і рухі. Мяняюцца цэнасныя арыентацыі раней узнікшых фарміраванняў. Узмацняецца паклёп на Кампартыю Беларусі. Вядома, яна не знімае з сябе адказнасці за тое, што адбылося і адбываецца ў рэспубліцы. Але нельга не бачыць, што сёння яе спрабуюць абвінаваціць нават у тым, да чаго яна не мае дачынення.

Нягледзячы на гэта, Кампартыя Беларусі застаецца асноўнай сілай, якая імкнецца да стабілізацыі становішча, стрымлівання процістаяння і экстрэмізму. У абстаноўцы нарастаючай палітычнай барацьбы камуністы павінны праявіць мужнасць і стойкасць. Ад гэтага таксама ў многім будзе залежаць лёс Айчыны.

## I.

За час, які мінуў пасля XXVIII з'езда КПСС і XXXI з'езда КПБ, некалькі ажывілася дзейнасць партыйных арганізацый і камітэтаў. Многія з іх, хоць і не так хутка, як хацелася б, збаўляюцца ад шоку, разгубленасці, набываюць упэўненасць у сваіх дзеяннях.

Больш прыкметным становіцца ўсведамленне камуністамі неабходнасці ўзмацнення свайго ўздзеяння на развіццё эканомікі, вырашэнне сацыяльных пытанняў. Умацоўваюцца сувязі і супрацоўніцтва з Саветамі народных дэпутатаў, маладзёжнымі і ветэранскімі арганізацыямі, творчай інтэлігенцыяй. Узмацніліся акцэнты на палітычную работу з насельніцтвам па месцы пражывання.

Гэта характэрна, у прыватнасці, для Воранаўскага, Капыльскага, Магілёўскага і Пастаўскага райкомаў, Светлагорскага і Пінскага гаркомаў партыі, партарганізацый мінскай швейнай фірмы «Мілавіца», калгаса «Праўда» Ганцавіцкага раёна, вышкамантажнага ўпраўлення аб'яднання «Беларусьнафта», вучгаса «Прынёманскі» Гродзенскага раёна, Віцебскага міжкалгаснага будаўнічага камбіната, Барысаўскай швейнай фабрыкі, Бялыніцкага крухмальнага завода.

Як паказваюць сустрэчы ў працоўных калектывах, людзі з адабрэннем адносяцца да некаторага ажыўлення ў партыі. Больш таго, яны патрабуюць ад нас праяўляць больш рашучасці і наступальнасці, заяўляюць аб сваёй падтрымцы ў пераадоленні цяжкасцей, навядзенні парадку і арганізаванасці.

Але для таго, каб выпрастацца ва ўвесь рост, загаварыць на поўны голас, партыйным арганізацыям трэба хутчэй збаўляцца ад разброду і пасіўнасці. Без дапамогі і падтрымкі ЦК і партыйных камітэтаў ім не выйсці з такога стану.

Вядома, ва ўмовах, калі шквал атак на КПСС нарастае, калі ў наяўнасці спроба ўбіць клін паміж партыяй і народам, паміж нізавымі звеннямі і яе кіраўніцтвам, зрабіць гэта нялёгка. Сітуацыя ўскладняецца і тым, што саюзнікамі нашых апанентаў стала нямала людзей з партыйнымі білетамі, якія імкнуцца ўзарваць партыю знутры.

У выніку — разгубленасць, адыход ад актыўнай палітычнай работы многіх камуністаў, здача партыйных білетаў. За мінулы год добраахвотна пакінулі КПСС больш як 63 тысячы членаў партыі.

Звыш 30 працэнтаў свайго саставу страцілі партыйныя арганізацыі Віцебскага тэлевізійнага завода, аб'яднанняў полацкага «Шкловалакно», Гомельскага дрэваапрацоўчага, магілёўскага «Хімвалакно», «Інтэграл», «Беларускалій».

Што ж рабіць у такой сітуацыі? Заняць пазіцыю неўмяшання? Працягваць панікаваць? Гэта не наша лінія паводзін. Змагацца за кожнага сумленнага камуніста, які стаў ахвярай узнікшых акалічнасцей і вырашыў пакінуць партыю ў гадзіну суровых выпрабаванняў, — вось што сёння ад нас патрабуецца.

На жаль, у многіх партыйных арганізацыях праяўляецца поўная раўнадушнасць да гэтага. У пераважнай большасці выпадкаў з выходзячымі з радоў КПСС нават не знайшлі час пагутарыць.

Але ёсць і абнадзейваючае. У КПБ не спыніўся прыток свежых сіл, хоць ён і невялікі. У мінулым годзе ў партыю ўступіла 7.647 чалавек. Гэта тыя, хто прайшоў выпрабаванне суровай рэчаіснасцю. Усвядомлена вызначыў сваю палітычную пазіцыю. Радуе таксама тое, што ў многіх людзей надыходзіць прасвятленне ў ацэнцы сітуацыі, яны бачаць, хто ёсць хто. Часцей сталі ўзнікаць сітуацыі, калі добраахвотна выйшаўшыя ў свой час з КПСС просяць аднавіць іх у партыі.

З другога боку, трэба рашуча і без прамаруджання збаўляцца ад кан'юнктуршчыкаў і адшчапенцаў. І рабіць гэта трэба галосна, не чакаючы, пакуль яны самі з высакародным жэстам пакладуць партыйныя білеты, як гэта зрабілі, скажам, старшыня Магілёўскага гарвыканкома т. Габрусеў, старшыня прэзідыума Заходняга аддзялення УАСГНІЛ т. Нікітчанка. Хоць ужо даўно было відаць, што для дасягнення сваіх амбіцыйных мэт яны парвалі з партыяй, адкрыта сталі на шлях яе арганізацыйнага расколу. У адносінах да падобных членаў КПСС крайне рэдка прымяняецца такая мера, як выключэнне іх з партыі.

Мне здаецца, што пара ўжо нам дакладна вызначыць свае палітычныя пазіцыі, ушчыльную ўзяцца за ўмацаванне ідэйнага адзінства партыі, дысцыпліны ў нашых радах. Трэба канчаць з кіпеннем страсцей і амбіцый з кожнага дробязнага выпадку, пераадолець процістаянне паміж вышэйстаячымі органамі і камуністамі, паміж партыйнымі камітэтамі розных узроўняў.

Словам, трэба хутчэй знаходзіць шляхі да ўзаемнага даверу, пры якіх наша палітычная арганізацыя не раз'ядноўвалася б на «вярхі» і «нізы», на процiборствуючыя групы, а стала б моцным саюзам аднадумцаў.

Відаць, было б правільным у бліжэйшы час правесці ва ўсіх пярвічных партарганізацыях сходы, на якіх камуністы павінны разабрацца з пазіцыяй кожнага партыйца, ацаніць стан дысцыпліны, свае ўзаемаадносіны.

Думаецца, перад гэтым можна арганізаваць індывідуальныя гутаркі, у ходзе якіх трэба дапамагчы камуністам асэнсаваць прынцыповыя палажэнні палітычных установак і нарматыўных дакументаў партыі, прынятых у апошні час. Вынікі гэтай работы трэба было б абагульніць у гаркомах, райкомах, абкомах і ЦК КПБ.

Аказваць дапамогу партарганізацыям у іх арганізацыйным і ідэйным умацаванні, павышэнні дысцыпліны, актыўнасці і адказнасці камуністаў заклікаты члены ЦК і Кантрольнай камісіі КПБ. У такой дапамозе ў першую чаргу маюць патрэбу партарганізацыі, якія аказаліся на грані развалу.

Прадстаўлены на абмеркаванне праект праграмы дзеянняў прадугледжвае шырокі спектр мер, накіраваных на арганізацыйна-палітычнае ўмацаванне Кампартыі Беларусі.

На мой погляд, заслугоўвае падтрымкі ідэя стварэння пры гарадскіх і раённых камітэтах партыі кансультацыйных цэнтраў. Важна актыўна задзейнічаць у іх інтэлектуальны патэнцыял навучальных і навуковых устаноў, інжынерна-тэхнічную і творчую інтэлігенцыю.

Уяўляецца карысным і стварэнне саветаў сакратароў пярвічных партарганізацый пры партыйных камітэтах. На ваш разгляд унесена прапанова аб парадку фарміравання такога савета пры ЦК Кампартыі Беларусі.

З усёй вастрынёй цяпер паўстала праблема выпрацоўкі новай кадравай палітыкі. Сёння на першы план выступае неабходнасць шукаць яркія асобы, фарміраваць з іх патэнцыяльных лідэраў і дэмакратычнымі метадамі вылучаць іх на кіруючую работу.

Важна вызначыць для кожнага партыйнага камітэта кола пасад, на якія ён рыхтуе і рэкамендуе работнікаў. Нам уяўляецца, што для Бюро ЦК КПБ — гэта сакратары абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі. Кандыдатуры на гэтыя пасады павінны ўсебакова вывучацца. Вядома ж, не выключаецца і альтэрнатыўны падыход. На пасяджэнні Бюро ЦК яны зацвярджаюцца пасля выбрання. Прыкладна такі падыход можа быць прымальным і ў адносінах да загадчыкаў аддзелаў ЦК, рэдактараў партыйных выданняў, кіраўнікоў навучальнага і навуковага інстытутаў кампартыі. Сваё кола пасад трэба мець і Сакратарыяту ЦК.

Што датычыць кадраў савецкіх, гаспадарчых, грамадскіх і іншых арганізацый, то тут сітуацыя іншая. Наша задача — фарміраваць грамадскую думку аб тым або іншым работніку, сілай аргументаў даказваць мэтазгоднасць вылучэння яго на адпаведную пасаду.

Вядома, гэтым не абмяжоўваецца работа партыйных камітэтаў. Яны павінны падтрымліваць пастаянныя сувязі з рэкамендуемымі, дапамагаць ім набываць і развіваць неабходныя якасці.

Уяўляецца, што Бюро ЦК Кампартыі Беларусі павінна мець сваю дакладную пазіцыю і па кіраўніках урада рэспублікі, міністэрстваў і ведамстваў, уносіць свае прапановы па кандыдатурах на гэтыя пасады ў Вярхоўны Савет БССР праз яго партыйную групу.

Мы з разуменнем паставімся да таго, калі апазіцыя будзе рэкамендаваць людзей са свайго круга. Няхай перамагае мацнейшы. Ад гэтага выйграе толькі справа.

Стройную сістэму работы з кадрамі трэба мець і абкомам, гаркомам, райкомам партыі.

Вядома ж, партыйным камітэтам не павінна быць абыякава, як той або іншы камуніст-кіраўнік апраўдвае іх давер. Тут пазіцыя неўмяшання не падыходзіць і можа мець негатыўныя вынікі.

Так, у свой час на пасаду дырэктара шклозавода імя Камінтэрна Бабруйскі райком партыі рэкамендаваў члена КПСС т. Талецкага. Калі пярвічная партарганізацыя стала прад'яўляць да яго абгрунтаваныя прэтэнзіі за недахопы ў рабоце, ён аб'явіў ёй сапраўдную вайну аж да выгнання партбюро з прадпрыемства. Сам выйшаў з КПСС і іншых цягнуў за сабой.

Райком жа партыі своечасова не паставіў на месца самавольнага адміністратара, не падтрымаў партыйную арганізацыю.

Нельга аслабляць увагу і да арганізацыі вучобы кадраў. Не трэба здаваць у архіў добра зарэкамендаваўшыя сябе такія формы работы з кадрамі, як гутаркі з імі, сустрэчы з сакратарамі ЦК, абкомаў, гаркомаў і райкомаў партыі, справаздачы камуністаў-кіраўнікоў аб выкананні імі сваіх партыйных і службовых абавязкаў.

Думаю, што партыйныя камітэты і арганізацыі падтрымаюць прыняты нядаўна Саветам Міністраў рэспублікі новы парадак найму і вызвалення кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў, заснаваны на заключэнні кантрактаў. Гэта дасць магчымасць надаць ім большую упэўненасць у рабоце, забяспечыць прававую і сацыяльную абароненасць.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы